пой со скрипкой») или верный друг-пес (Рембрандт «Слепой музыкант», С. Евдокимов «Слепой скрипач») [1].

Репрезентация образов в творчестве художников порой получает необычное воплощение в «иносказательных» формах, одна из которых связана с темой смерти. Данное направление является весьма интересным с точки зрения трактовки образа музыканта и специфическим сугубо для европейского искусства.

Обращение к образу музыканта в европейском искусстве не ослабевает до сих пор – современные художники затрагивают различные стороны творчества музыкантов-исполнителей, демонстрируя тем самым свою любовь к музыке: серия работ Р. Вуда «The Rolling Stones» (2005–2018), Дж. Кантазаро «Два музыканта» (2010) и др. Каждая из указанных и проанализированных нами картин представляет собой индивидуальную форму воплощения автором образа музыканта, созданную художественными средствами. Вместе с тем в ряде работ можно проследить определенное сходство в трактовке образа музыканта, представлениях о музыкальных инструментах и процессе музицирования.


1. *Гнедич, П. П.* История искусств. Живопись. Скульптура. Архитектура / П. П. Гнедич. – М. : Эксмо, 2002. – 848 с.

2. История русского искусства : в 2 т. / под ред. М. Г. Неклюдовой, М. Б. Милотворской. – М. : Изобразительное искусство, 1980. – Т. 2 : Искусство второй половины XIX века. – Кн. 1. – 317 с.

3. *Сарабьянов, Д. В.* Русская живопись XIX века среди европейских школ / Д. В. Сарабьянов. – М. : Сов. художник. – 264 с.

4. *Buettner, S.* Great Composers Great Artists: Portraits / S. Buettner, G. P. Reinhard. – Amadeus Press : Huddersfield, 1992. – 172 p.



**Ю. С. Барадзін,** *аспірант.*

Навуковы кіраўнік – **А. Д. Крывалап,**

*кандыдат культуралогіі*


## МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ І СКАНДЫНАЎСКАЙ МІФАЛОГІІ

Міфалогія як першапачатковая форма духоўнай культуры прадстаўляе сабой своеасаблівую сістэму, дзе кожны элемент

адпавядае цэламу. Даследаванне беларускай і скандынаўскай міфалогіі адбываецца праз іх параўнанне: усталёўваецца падабенства функцый беларускіх і скандынаўскіх дэміургаў (багоў). Выўляюцца функцыі геаічнага міфа – іспыты, барацьба, перамога, смерць, уваскрашэнне. Вывучэне спецыфікі міфу праводзіцца з дапамогай структурна-функцыянальнага метаду, распрацаванага французскім этнолагам К. Леві-Стросам. Тыпалагічны метад дазваляе раскрыць тыя элементы міфа, што паўтараюцца ў развіцці сюжэтаў у розных міфалогіях. У структурна-тыпалагічным метадзе розныя светы блізкія адзін аднаму. Згодна канцэпцыі Леві-Строса, міф як адносіцца да падзеяў мінулага, пачынаючы ад стварэння свету, так і тлумачыць цяперашні час і будучыню [8, с. 111].

У беларускай і скандынаўскай міфалогіі, як падкрэслівае беларускі літаратуразнавец Аляксей Ненадавец, спачатку замест свету існуюць толькі хаос і пустэча [10, с. 14]. Потым з’яўляюцца першабагі (продкі беларускіх і скандынаўскіх дэміургаў), ствараюць Сусветныя Дрэвы (дрэва беларусаў не мае імя, скандынаўскае дрэва завецца «Ігдрасіль»), на якіх трымаецца ўвесь свет. Толькі разбурэнне дрэва можа паскорыць эсхаталогію (канец свету і гібель багоў) [Там жа, с. 149]. Паміж беларускай і скандынаўскай міфалогіямі ёсць як падабенствы, так і адрозненні. Напрыклад, эсхаталогія, якая ў скандынаўскай міфалогіі прадстае ў выглядзе «Рагнароку», не прадугледжана ў беларускай міфалогіі. У беларусаў багі – несмяротныя, у скандынаваў – такія ж смяротныя, як людзі. У той час, калі скандынаўскім багам было наканавана загінуць у апошні дзень бітвы са злом, а старому скандынаўскаму свету – быць знішчаным вогненным полымем ад мяча волата Сурта (а затым нарадзіцца зноў), то ў беларускай міфалогіі дабро і зло былі аднолькава несмяротныя і ўвесь час перамагалі адзін аднаго.

Як у беларускай, так і ў скандынаўскай міфалогіі існуе барацьба паміж дабром і злом, а таксама злыя і добрыя. У беларусаў і скандынаваў сустракаюцца дэміўргі з падобнымі функцыямі: Пярун і Тор (багі грому), Зюзя, Улль і Скаддзі (багі і багіня зімы), Лёля, Ярыла і Бальдр (багіня і багі вясны), Пярун і Одзін (багі вайны), Сварог і Вёлунд (багі-кавалі), Чарна-

бог і Локі (багі зла), Лада і Фрэйя (багіні любові), Дажбог і Фрэйр (багі сонца), Сварог і Локі (багі агню), і г. д.

Даследаванне вобразаў гераічных персанажаў беларускай і скандынаўскай міфалогіі абапіраецца на архетыпы, ля вытокаў якіх стаяў швейцарскі вучоны К. Юнг. Міфалагічныя архетыпы займаюць важнае месца ў духоўнай культуры, бо архетыпнае мысленне з'яўляецца базісам культуры. Гісторыя культурнага досведу перадаецца з пакалення ў пакаленне праз агульнаэтнічную памяць і міфалагічную свядомасць, якая прадстаўляе нацыянальную культуру народаў.

Дзякуючы архетыпам, як падкрэсліў К. Юнг, у чалавеку прачынаюцца галасы старажытных багоў і продкаў, да якіх ён адчувае сваю прыналежнасць. Такім чынам праз архетыпы чалавек вяртаецца да сваіх каранёў [13, с. 5]. Архетыпы спрыяюць глыбокаму разуменню нацыянальнай карціны свету і яе ролі ў беларускім і скандынаўскіх грамадствах. Без вывучэння міфалогіі, паняцця аб гісторыі і мінулым свайго народу чалавецтва губляе будучыню, што вядзе да дэградацыі наступных пакаленняў. Аднаўленне язычніцкай спадчыны беларускага і скандынаўскіх народаў з'яўляецца вельмі важным, паколькі язычніцкая міфалогія цесна звязана з іх духоўнай культурай.

Тэарэтычную і метадалагічную аснову даследавання склалі, таксама, філасофскія канцэпцыі міфа, якія разглядаюць яго ў якасці неабходнага структурнага элемента быцця культуры. Гэта праца Р. Барта «Мифологии» [1], К. Хюбнера «Истина мифа» [12], Р. Брамбо «Философы Древней Греции» [2], «Навука і міф» у канцэпцыях П. Фейрабенда і А. Ф. Лосева [9]. Роберт Брамбо – амерыканскі вучоны, аўтар твора «Философы Древней Греции» – спасылаецца на тое, што філасофія ўзаемадзейнічае з міфалогіяй і што міфалогія з'яўляецца тлумачэннем прыроды [2, с. 4]. Нямецкі філосаф Х.-Г. Гадамер даследаваў псіхааналіз Карла Юнга і прыйшоў да высновы, што з дапамогай міфа і розуму чалавечае быццё здольнае разумець само сябе [3, с. 144]. Ісціну міфа Гегель бачыць у імкненні пазнаваць прыродныя з'явы ў форме язычніцкага боства. У філасофіі, на думку Гегеля, магчыма знайсці канчатковую ісціну міфа [4, с. 344]. К. Хюбнер, аўтар філасофскага твору «Истина мифа», прадстаўляе міф як спадчыну даўняга мінулага [12, с. 5].

Міф таксама мае ўзаемасувязі і з рэальнасцю, бо міф – рэальны для чалавека, які жыве ў ім. Рэальнасць міфа ў тым, што ён стварае структуру жыццёвага свету. Шэлінг лічыць міф вышэйшай формай навукі, бо філасофія і міф у аднолькавай ступені спасцігаюць ісціну. Філасофія абгрунтоўвае сутнасць міфа. Міф валодае пачуццём сувязі з сіламі жывой прыроды, а таксама з светам, які створаны дэміўргамі [5]. Галоўная думка аўстрыйскага філосафа К. Попера заключаецца ў тым, што хаця навуковыя міфы адыходзяць ад рэлігійных, пад уплывам крытыкі міфы даюць больш тлумачальнае разуменне навакольнага свету [11]. З пазіцыі Фейрабенда захаванне культурных традыцый старажытных продкаў з'яўляецца адной з галоўных рысаў міфа, і таму міфалогію нельга аддаляць ад навукі. Такой жа думкі прытрымліваўся расійскі філосаф А. Лосеў. Міфалогія, на думку Лосева, у першую чаргу дае для навукі першапачатковы матэрыял. Навука як не нараджаецца з міфа, так і не можа існаваць без яго [9]. Французскі філосаф Р. Барт сцвярджае, што сэнс міфа валодае каштоўнасцю, і што міф складае частку нейкай гісторыі [1, с. 128]. Напрыклад, гістарычны эпас беларускага альбо скандынаўскіх народаў. Носьбітам міфічнага слова можа служыць не толькі вуснае слова ці пісьмовы дыскурс, але і кіно, музыка, выяўленчае мастацтва, навуковая альбо мастацкая літаратура, тэатры, спектакль, рэклама.

Нягледзячы на тое, што пасля X ст. хрысціянства паступова выцясняла язычніцтва, язычніцкая міфалогія, падкрэсліваюць І. Клімковіч і Л. Дучыц, актыўна працягвае развіццё ў культуры XX–XXI стст. праз фальклорныя абрады, сярод якіх вызначаюцца язычніцкія святы беларусаў – Дзяды, Радуніца, Купалле, Каляды, Гуканне вясны, Ваджэнне куста, Пахаванне стралы [6, с. 6]. Скандынаўскія народы таксама захоўваюць язычніцкія традыцыі вікінгаў праз народную творчасць, гістарычныя фільмы і серыялы.

Амерыканскі філосаф і гісторык Т. Кун, які з'яўляецца аўтарам тэрміну «нармальная навука», падкрэслівае, што ён не ставіць перад сабой мэту знаходжання новага факта альбо тэорыі, а поспех у навуковым даследаванні заключаецца ў тым, што зноў аналізуюцца навуковыя даследаванні [7, с. 12]. Такім чы-

нам, каб вывучаць беларускую і скандынаўскую міфалогію, трэба пабудаваць параўнальныя генеалагічныя дрэвы беларускіх і скандынаўскіх багоў, абапірацца на мінулае (гераічны эпас беларускага і скандынаўскіх народаў, на міфалогію і язычніцтва старажытных продкаў) і праз гэтыя даследаванні атрымаць прызнанне навуковай якасці наступнага развіцця.

1. *Барт, Р.* Мифологии / Р. Барт ; пер. с фр. С. Зенкина. – М. : Акад. проект, 2008. – 178 с.

2. *Брамбо, Р. С.* Философы Древней Греции / Р. С. Брамбо ; пер. с англ. Л. А. Игоревского. – М. : Центрполиграф, 2010. – 347 с.

3. *Гадамер, Х.* Истина и метод / Х. Гадамер ; пер. с англ., нем. Б. Н. Бессонова. – М. : Прогресс, 1988. – 704 с.

4. *Гегель, Г. В. Ф.* Феноменология духа / Г. В. Ф. Гегель ; пер. с нем. Г. Г. Шпета. – М. : Наука, 2000. – 495 с.

5. *Заугольникова, А. В.* Философия мифа Ф. В. Й. Шеллинга [Электронный ресурс] / А. В. Заугольникова. – Режим доступа: https://lib.herzen.spb.ru/media/magazines/contents/1/107/zaugolnikova_107_89_94.pdf. – Дата доступа: 13.03.2022.

6. *Клімковіч, І.* Язычніцтва старажытных беларусаў / І. Клімковіч, Л. Дучыц. – Мінск : Харвест, 2018. – 368 с.

7. *Кун, Т.* Логика и методология науки. Структура революций / Т. Кун ; пер. с англ. И. З. Налетова. – М. : Прогресс, 1975. – 288 с.

8. *Леви-Стросс, К.* Структурная антропология / К. Леви-Стросс ; пер. с фр. В. В. Иванова. – М. : Эксмо-Пресс, 2001. – 266 с.

9. *Михалевская, А. С.* Наука и миф в концепциях Пола Фейрабенда и А. Ф. Лосева [Электронный ресурс] / А. С. Михалевская. – Режим доступа: http://www.unn.ru/pages/e-library/vestnik_soc/99990201_West_soc_2011_2(22)/15.pdf. – Дата доступа: 13.03.2022.

10. *Ненадавец, А. М.* Міфалогія маіх продкаў / А. М. Ненадавец. – Чарнігаў : Всессвіт, 2009. – 400 с.

11. *Поппер, К.* Предложения и опровержения. Рост научного знания [Электронный ресурс] / К. Поппер. – Режим доступа: https://gtmarket.ru/library/basis/4711/4716. – Дата доступа: 13.03.2022.

12. *Хюбнер, К.* Истина мифа / К. Хюбнер ; пер. с нем. И. Касавина. – М. : Республика, 1996. – 252 с.

13. *Юнг, К. Г.* Душа и миф: шесть архетипов / К. Г. Юнг ; пер. с англ. В. В. Наукманова. – М. : Совершенство, 1997. – 387 с.